# МЫ ВЫКАНАЕМ, ПАРТЫЯ, ТВАЕ ПРАДВЫЗНАЧЭННІ!

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 6 (351) | Субота, 7 лютага 1959 года | Цана 20 кап.

☆ ☆ ☆

*Уся ідэалагічная работа нашай партыі і дзяржавы заклікана развіваць новыя якасці савецкіх людзей, выхоўваць іх у духу калектывізма і працавітасці, сацыялістычнага інтэрнацыяналізма і патрыятызма, высокіх прынцыпаў маралі новага грамадства, у духу марксізма-ленінізма.*

(З даклада М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС).

## Нечарговы XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза закончыў сваю работу

5 лютага 1959 года закончыў сваю работу нечарговы XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

З заключным словам выступіў цёпла сустрэты дэлегатамі і гасцямі Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР тав. М. С. Хрушчоў. Яго выступленне было выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася апладысментамі.

З'езд пераходзіць да абмеркавання і прыняцця рэзалюцыі па дакладу тав. М. С. Хрушчова і зацвярджання кантрольных лічбаў развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады. Аднагалосна прымаецца рэзалюцыя па дакладу тав. М. С. Хрушчова і зацвярджаюцца кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады.

Тав. М. С. Хрушчоў ад імя Прэзідыума з'езда уносіць прапанову прыняць пастанову аб скліканні чарговага XXII з'езда КПСС не ў 1960 годзе, згодна са Статутам партыі, а ў 1961 годзе. Гэта рашэнне дэлегаты з'езда прымаюць аднагалосна.

Парадак дня вычарпаны, гаворыць М. С. Хрушчоў, рашэнні прыняты. Дазвольце нечарговы XXI з'езд КПСС, які партыяй і народам названы з'ездам будаўнікоў камунізма, аб'явіць закрытым.

У зале ўспыхвае авацыя. Усе ўстаюць. Дэлегаты і госці пяюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

(ТАСС).

## УКЛАД У СКАРБНІЦУ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

**Вялікае значэнне для далейшага развіцця грамадскіх навук мае тая частка даклада М. С. Хрушчова XXI з'езду партыі, дзе гаворыцца аб важнейшых пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва.**

**У дакладзе атрымала бліскучае развіццё марксісцка-ленінскае вучэнне аб двух фазах камунізма, аб характары паступальнага руху ад сацыялізма да камунізма. М. С. Хрушчоў абгрунтаваў тры важнейшыя палажэнні: 1) Пераход ад сацыялізма да камунізма — гэта заканамерны гістарычны працэс, які нельга парушыць, абыйсці. 2) Пры ўсім адрозненні камунізма ад сацыялістычнай стадыі паміж імі няма нейкай сцяны, якая аддзяляла б гэтыя фазы грамадскага развіцця. 3) Нельга разумець пераход ад сацыялізма да камунізма як запаволены рух.**

**Не толькі тэарэтычнае, але і вялікае практычнае значэнне маюць і іншыя пытанні, якія разглядаюцца ў дакладзе. Яскрава характарызуюцца шляхі развіцця і збліжэння капераціўна-калгаснай і агульна-народнай уласнасці. Вялікую цікавасць прадстаўляе развіццё М. С. Хрушчовым вучэння аб дзяржаве і яе функцыях у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма.**

**Вельмі важным з'яўляецца палажэнне даклада аб дзеянні ў сацыялістычнай сістэме гаспадаркі новых эканамічных законаў, якія дазваляюць усім краінам сацыялізма амаль адначасова прыйсці да камунізма.**

**У скарбніцу марксізма-ленінізма ўвойдзе і шэраг іншых палажэнняў даклада М. С. Хрушчова. Гэты даклад—узор творчага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі.**

**А. САМАЛЬ,**
**аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.**

☆ ☆ ☆

## *ВЫКАНАЕМ НАШ ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК*

Мы шчаслівыя, што жывем у гады смелых задумаў і велічных здзяйсненняў, у гады дзёрзкай мары, якая на вачах становіцца прыгожай рэчаіснасцю. Савецкі чалавек першым зрабіў крок у космас. Над усімі краінамі высока ў небе бачны ўсім народам лятае трэці штучны спадарожнік Зямлі, а яшчэ вышэй, у космасе, ляціць зробленая рукамі савецкіх людзей штучная планета. Савецкі чалавек утаймаваў сакрушальную сілу атама і прымусіў яе круціць турбіны электрастанцый.

А што будзе праз 7 год, якой стане наша краіна за гэты час? Аб гэтым падрабязна расказаў у сваім дакладзе на XXI з'ездзе М. С. Хрушчоў. Чытаем даклад, і сэрца напаўняецца вялікай радасцю і гордасцю за краіну нашу, за наш народ-стваральнік.

Мы пакуль што студэнты. Але праз год мы пакінем сцены ўніверсітэта. І дзе б не давялося нам працаваць, мы заўсёды будзем памятаць аб адказнай ролі савецкага друку ва ўсёй ідэйна-палітычнай і арганізацыйнай рабоце партыі.

**Р. РАЗАНСКІ,**
**Н. ЛЯУДАНСКАЯ,**
**студэнты IV курса аддз. журналістыкі.**

## Выхоўваць свядомых будаўнікоў камунізма

☆

**В. АЛЯКСЕЕЎ,**
**сакратар партыйнага бюро гістфака.**

☆

Закончыў сваю работу XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Ён абмеркаваў і зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады, выкананне якіх з'явіцца крокам уперад у справе стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

У дакладзе М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе падкрэсліваецца, што ў адпаведнасці з задачамі развіцця народнай гаспадаркі і культуры прадугледжваецца далейшае пашырэнне і паляпшэнне падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. За 1959—1965 гады будзе выпушчана з вышэйшых навучальных устаноў 2 мільёны 300 тысяч спецыялістаў супраць 1 мільёна 700 тысяч чалавек за 1952—1958 гады, гэта значыць, у 1,4 разы больш. У сувязі з гэтым узрастае роля ўніверсітэтаў, якія абавязаны значна павялічыць выпуск спецыялістаў па новых раздзелах матэматычных, біялагічных, фізічных і хімічных навук і ўзмацніць у цэлым тэарэтычную і практычную падрыхтоўку спецыялістаў па важнейшых праблемах прыродазнаўчых і гуманітарных навук. Для таго, каб ператварыць у жыццё гэтую велічную праграму, партыя лічыць неабходным не толькі стварыць магутную матэрыяльна-тэхнічную базу і падрыхтоўваць у сувязі з гэтым тэхнічна-адукаваныя кадры, але і ўзняць высока ідэйную свядомасць усіх грамадзян сацыялістычнага грамадства.

Ідэалагічнае выхаванне студэнцкай моладзі з'яўляецца важнейшым і пачэсным абавязкам прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ. Асабліва вялікую ролю тут павінны адыграць кафедры грамадскіх навук, выкладчыкі якіх абавязаны глыбока растлумачваць студэнтам значэнне сямігадовага плана, пастаянна падкрэсліваючы, што ў ім знаходзіць сваё далейшае творчае развіццё шэраг прынцыповых пытанняў марксісцка-ленінскай тэорыі. Пастаянным клопатам выкладчыкаў грамадскіх навук павінна быць выхаванне студэнтаў у духу высокіх прынцыпаў камуністычнай маралі, любві да працы, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі.

У справе фарміравання новага чалавека мае вялікае значэнне выхаванне ў студэнтаў пачуцця калектывізма і навыкаў да працы. У спалучэнні вытворчай працы з навучаннем К. Маркс бачыў не толькі адзін са сродкаў павелічэння грамадскай вытворчасці, але і велічны сродак для «вытворчасці ўсебакова развітых людзей».

Пераважная маса студэнцтва ўніверсітэта добрасумленна папрацавала ў мінулым годзе на ўборцы ўраджаю і на сельскагаспадарчых работах у Мінскай вобласці. Многія студэнты недрэнна працавалі на будаўніцтве галоўнага корпуса і інтэрната універсітэта. Авангардную ролю пры выкананні ўсіх відаў фізічных работ займаюць, як правіла, студэнты-камуністы.

Аднак некаторая частка студэнтаў усё яшчэ прадаўжае папанску адносіцца да фізічнай грамадска-карыснай працы (Іваньковіч, Каблова і інш.) Ёсць яшчэ і такія студэнты (Вінаградаў, Радкевіч, Васілюк, Кірэеў), якія ўхіляюцца не толькі ад удзелу ў грамадска-карыснай фізічнай працы, але і ад удзелу ў грамадскім жыцці факультэтаў універсітэта. Яны на першы план высоўваюць свае асабістыя інтарэсы, зусім забываючы аб сваім абавязку перад калектывам. Павышэнне камуністычнай свядомасці і актыўнасці студэнтаў з'яўляецца асноўнай задачай усёй універсітэцкай грамадскаці.

Адказваючы на пытанне, якім павінен быць малады чалавек камуністычнага грамадства, М. С. Хрушчоў у сваёй прамове на ўрачыстым Пленуме ЦК ВЛКСМ, прысвечаным 40-годдзю камсамола, гаварыў, што «...ён павінен заўсёды і ва ўсім, на любым пасту, у любой справе быць барацьбітом і рэвалюцыянарам. Гэта значыць—ясна ўсведамляць, што нарадзіўся ты не проста для таго, каб пражыць табе прызначаныя гады. Ты нарадзіўся ў сацыялістычным грамадстве і жывеш не толькі для сябе, але, раней за ўсё для грамадства, якое ідзе да вялікай мэты. І таму ўсе твае справы, думкі і звычкі павінны быць падпарадкаваны гэтай высокароднай мэце».

Высокія прынцыпы марксізма новага ладу патрабуюць рашаючага выкаранення такіх чужых для сацыялістычнага грамадства з'яў, як хуліганства, п'янства, нядбайныя, варварскія адносіны да сацыялістычнай уласнасці і другіх агідных перажыткаў праклятага мінулага. Нажаль, гэтыя ганьбячыя чалавека ўчынкі яшчэ дапускаюць некаторыя студэнты (Л. Наркевіч, А. Кісялёў).

Камсамольская і прафсаюзная арганізацыі недастаткова выкарыстоўваюць у справе выхавання студэнтаў такую важную форму грамадскага ўздзеяння і выхавання, як агульныя камсамольскія і прафсаюзныя сходы. Агульнафакультэцкія камсамольскія і прафсаюзныя сходы праводзяцца ад выпадку да выпадку. Пры такой пастаноўцы работы камсамольскія і прафсаюзныя кіраўнікі замыкаюцца ў вузкім коле актыву, адрываючыся фактычна ад асноўнай масы студэнцтва.

З вопыта работы замацаваных за акадэмічнымі групамі выкладчыкаў гістарычнага факультэта т.т. Баранавай, Фрыдман, Панкратава, Мельцэр, Нікольскай і іншых відаць, што пры добра прадуманым плане работы можна дабіцца значных поспехаў у справе ідэйнага выхавання студэнцтва.

Надзвычайна вялікае значэнне ў справе павышэння ўзроўню ідэалагічнага выхавання студэнцтва маюць адкрытыя партыйныя сходы. Партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта правяла пасля справаздачнага сходу два адкрытыя партыйныя сходы. На гэтых сходах былі абмеркаваны пытанні аб самастойнай рабоце студэнтаў, аб стане і мерах па паляпшэнню палітыка-выхаваўчай работы ў студэнцкіх групах, аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР. Студэнты прымалі актыўны ўдзел ва ўсіх абмяркоўваемых пытанях, уносілі каштоўныя прапановы, накіраваныя на ліквідацыю недахопаў, маючых месца ў жыцці факультэта. Зразумела, што такая форма работы не з'яўляецца новай. Аднак яе трэба шырока практыкаваць. Пры добрай папярэдняй падрыхтоўцы такія сходы могуць адыграць вялікую ролю ў справе партыйнага камуністычнага ўплыву на студэнцкую моладзь.

Уся работа па ідэалагічнаму выхаванню студэнцтва павінна быць падпарадкавана на даным этапе галоўнай задачы—мабілізацыі ўсіх сіл на выкананне рашэнняў XXI з'езда Камуністычнай партыі Савец-



**Студэнты філалагічнага факультэта вывучаюць матэрыялы нечарговага XXI з'езда КПСС.**

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# НА ЗАВОДЫ, У КАЛГАСЫ, ШКОЛЫ...

Камсамольцы ўніверсітэта горача ўспрынялі Закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі ў СССР». На сваіх сходах яны ўносяць канкрэтныя прапановы, накіраваныя на паспяховае ператварэнне Закона ў жыццё

Так, напрыклад, камсамольцы IV курса хімічнага факультэта рашылі паслаць 10 студэнтаў у школы горада ў якасці піянерважатых. Аналагічныя рашэнні былі прыняты на другіх курсах.

Камітэт камсамола ўніверсітэта падтрымаў ініцыятыву груп. На расшыраным пасяджэнні сумесна з камсоргамі курсаў было вырашана паслаць 110 студэнтаў для работы піянерважатымі ў школы горада, 65 камсамольцаў — у маладзёжныя інтэрнаты рабочых і 50 — у вайсковыя часці, для аказання практычнай дапамогі навучаючымся.

Студэнты БДУ аказваюць дапамогу сваім надшэфным у вучобе — у авалоданні рускай, беларускай і замежнай мовамі, матэматыкай, фізікай, літаратурай і іншымі дысцыплінамі. Сярод «вучняў» нашых студэнтаў—рабочыя, якія займаюцца ў вячэрніх сярэдніх школах, тэхнікумах, на завочных аддзяленнях ВНУ. Аказваецца дапамога і тым, хто марыць у гэтым годзе паступаць ва ўніверсітэт і іншыя ВНУ рэспублікі.

Стала ўжо традыцыяй праводзіць сумесныя вечары адпачынку студэнтаў універсітэта і рабочых аўтазавода. У хуткім часе адбудзецца вечар выдатнікаў вучобы ўніверсітэта з членамі камуністычных брыгад завода.

Цесную сувязь падтрымлівае шматлікі камсамольскі калектыў універсітэта са школамі горада Мінска. Гэта сувязь вельмі карысна як для школы, так і для студэнтаў — будучых педагогаў. Так у сярэдняй школе № 4 студэнткі 2 курса гістарычнага факультэта Р. Акуліч і Д. Сямёнава працуюць піянерважатымі, дапамагаюць піянерскай арганізацыі школьнікаў у правядзенні збораў атрадаў і дружын, робяць усё для таго, каб яны былі цікавымі. На зборах піянерскіх атрадаў і дружын Сямёнава і Акуліч арганізавалі сустрэчу з старымі камуністамі, студэнтамі універсітэта — удзельнікамі ўборкі ўраджаю на цалінных землях Казахстана, знатнымі людзьмі горада — перадавікамі вытворчасці, правялі нядзельнік па збору металалому на заводзе імя Кірава. У 6-а класе нашы студэнткі сумесна з піянерамі стварылі лялечны тэатр.

Другі год пры універсітэце працуе матэматычны гурток школьнікаў. Работай гуртка кіруе член камітэта камсамола, малады выкладчык М. Неменман. Выдавецтва універсітэта надрукавала праграмы заняткаў гуртка, якія былі разасланы па школах горада Мінска. Заняткі гуртка заўсёды праходзяць пры перапоўненай аўдыторыі. Членам гуртка чытаюць лекцыі прафесары В. І. Крылоў, Д. А. Супруненка, дацэнт А. Н. Нахімоўская. Удзельнікі гуртка В. Багрынцаў, В. Куклін, Н. Трэцьякова і іншыя паспяхова здалі ўступныя экзамены ва ўніверсітэт і зараз займаюцца на першым курсе матэматычнага факультэта.

Студэнты геаграфічнага факультэта шэфствуюць над дзіцячым домам № 8. У навагоднія святы група студэнтаў геафака правяла там вечар. Дзеці атрымалі на гэтым вечары падарункі ад студэнтаў. Сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта Сяргей Быстрык расказаў аб вучобе студэнтаў, аб будаўніцтве галоўнага вучэбнага корпуса і інтэрната універсітэта і аб удзеле камсамольцаў у будаўніцтве.

Многа ўвагі надаюць шэфскай рабоце члены камітэта камсамола студэнты Света Рудзяк і Саша Ванькевіч. Света Рудзяк не толькі ўзначальвае шэфскую работу камсамольцаў, але і сама паказвае прыклад у гэтай справе. Знаходзячыся на ўборцы цалінага ўраджаю, яна ў вольны ад работы час працавала піянерважатай у школе саўгаса «Нежынскі» Рузаеўскага раёна, Какчэтаўскай вобласці. Дырэктар школы Мубарак Сабулавіч выказаў ёй падзяку. Зараз Света працуе піянерважатай у адной з школ горада.

Камсамольцы універсітэта ўжо не першы год падтрымліваюць сувязь з воінамі Беларускай ваеннай акругі. У студзені быў праведзен вечар воінаў-выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі са студэнтамі і членамі брыгад камуністычнай працы горада. На гэтым вечары студэнт універсітэта Саша Ванькевіч расказаў аб сваім шляху ад воіна да рабочага і студэнта. «Для кожнага рабочага шырока адкрыты дзверы ў наш універсітэт»,—сказаў ён пад апладысменты прысутных

Ні адзін урачысты вечар на фізічным і матэматычным факультэтах не праходзіць без удзелу воінаў. У сваю чаргу студэнты—частыя госці ў воінаў. Яны аказваюць ім вялікую дапамогу ў правядзенні тэматычных вечароў. Студэнты фізічнага факультэта Г. Палешукова, Р. Шэршань і інш. рэгулярна наведваюць падшэфную воінскую часць, выступаюць там з дакладамі і канцэртамі мастацкай самадзейнасці. З года ў год мацнее дружба студэнтаў універсітэта з маракамі ваеннага крэйсера і курсантамі Мінскай спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі.

Ужо больш пяці год студэнты ўніверсітэта шэфствуюць над калгасамі «Камінтэрн» і «Камунар» Дзяржынскага раёна. Для калгаснікаў чытаюцца лекцыі, даюцца канцэрты. У калгасе «Камінтэрн» камсамольцы ўніверсітэта стварылі бібліятэку, аказалі дапамогу ў выпуску шматтыражнай газеты «Ленінскі шлях» у рабоце камсамольскай арганізацыі калгаса.

Зараз студэнты ўніверсітэта здаюць экзамены. Па канікул яны зноў пойдуць на заводы, у школы і калгасы, вайсковыя часці.

В. ЛАЗОЎСКІ.
І. СТАРАВОЙТАЎ.

Трэба толькі доўга і ўважліва глядзець на яе. І вось перад вамі не карта, а адзін з ажыўшых куткоў зямнога шара. Горача. Па вашаму твару цячэ пот. Кругом трапічны лес, з якога вам здаецца, што вы ніколі не выйдзеце.

Чуецца якісьці гук. Ваш прывід у момант знікае. Вы ўзнімаеце галаву і пазіраеце ў вакно: па вуліцы праязджае снегачысціцель. Географу асабліва трэба яркае ўяўленне. Без яго карта—гэта толькі шматок паперы.

Географ—гэта чалавек, які носіць у галаве ўвесь свет. Дрэнна, калі спрабуеш вывучыць гэты свет за адзін дзень. Да вечара ў галаве хаос, як пры стварэнні свету.

Ноччу табе сніцца, што ўвесь гэты вінегрэт з жывёл, рэк, людзей і гор носіцца за табой і пытае: «Дзе нам быць, цячы, жыць???»

Цікава быць географам!

Фотаэцюд А. ЛУКАШОВА.

## НОВАЕ НА ГЕАФАКУ

Планы геаграфічнага факультэта па спецыяльнасці эканамічнай і фізічнай геаграфіі складзены ў адпаведнасці з Законам аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі.

У новым плане прадугледжана ўзмацненне практычнай падрыхтоўкі і самастойнай работы студэнтаў. У чэрвені месяцы значнае месца адводзіцца правядзенню вытворчай практыкі.

Па новым плане некаторыя дысцыпліны будуць зняты або пераведзены на факультатыўныя. Так, напрыклад, будзе чытацца курс методыкі фізіка-эканамічных даследванняў для абедзьвух, спецыяльнасцей. Паменшана колькасць гадзін па курсу агульнага землякарыстання. уводзіцца новы курс асноў астраноміі; курсы па геаграфіі транспарту, геаграфіі насельніцтва будуць чытацца для абедзьвух спецыяльнасцей.

Гэта тлумачыцца тым, што выпускнікі будуць у большасці працаваць у школе, а значыць, ім неабходна і больш шырокая спецыялізацыя. Акрамя таго яны змогуць весці ўрокі ў парадку дагрузкі да аб'ему работы па геаграфіі ( напрыклад, урокі па астраноміі).

З мэтай паляпшэння самастойнай работы і лепшага кантролю над працай завочнікаў па картаграфіі прадугледжана выкананне кантрольнай і курсавой работы, а таксама павелічэння ліку гадзін па чарчэнні па курсу геадэзіі. Акрамя таго, для завочнікаў і стацыянара па профілю геаграфічнай падрыхтоўкі прадугледжваецца вытворчая экскурсія на 4 нядзелі.

Гэтыя планы дапамогуць студэнтам яшчэ глыбей авалодаць гісторыяй і практыкай па выбраных спецыяльнасцях, глыбей пазнаць вытворчасць.

Б. ФРАЛОЎ.

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ

**Калектыў універсітэта вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Савецкай выбарчай акрузе № 2 г. Мінска члена Прэзідыума ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС А. І. Кірычэнку і першага сакратара Мінскага гаркома КПБ т. А. Д. Рудака. Прафесар М. Я. Ярмоленка вылучан кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.**

☆ ☆ ☆

58 аўдыторыя біялагічнага корпуса перапоўнена. Сюды сабраліся студэнты, прафесары, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта для таго, каб назваць сваіх кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР і органы мясцовай улады.

Бурнымі апладысментамі сустракаюць прысутныя прапанову рэктара універсітэта А. Н. Сеўчанкі аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР члена Прэзідыума ЦК КПСС і сакратара ЦК КПСС т. А. І. Кірычэнкі. А. Н. Сеўчанка характарызаваў т. Кірычэнку, як адданага сына Камуністычнай партыі, аднаго з таленавітых яе кіраўнікоў.

На трыбуне сакратар партыйнага камітэта універсітэта С. Я. Янчанка. Ён прапануе вылучыць першага сакратара Мінскага гаркома КПБ т. А. Д. Рудака кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

Дэкан хімічнага факультэта І. Г. Цішчанка прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Савета дэпутатаў працоўных прафесара М. Ф. Ярмоленку. Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта з вялікім уздымам прымаюць гэтыя прапановы.

Была прынята пастанова прасіць акруговую выбарчую камісію па Савецкай выбарчай акрузе № 2 г. Мінска ўключыць тт. А. І. Кірычэнку, А. Д. Рудака і М. Ф. Ярмоленку ў спісы кандыдатаў у дэпутаты.

## Хроніка камсамольскага жыцця

☆

АДБЫЛОСЯ пасяджэнне камітэта камсамола універсітэта. Члены камітэта разам з сакратарамі факультэцкіх камсамольскіх бюро і адказнымі за вучэбную работу на факультэтах абмеркавалі вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі на I і V курсах. Па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў. Ён сказаў:

— У параўнанні з мінулым годам вынікі экзаменацыйнай сесіі значна горшыя. Так, на I курсе фізічнага факультэта налічваецца 21 дрэнная адзнака. Тлумачыцца гэта тым, што большасць праваліўшых экзамены на працягу семестра прапускалі вучэбныя заняткі.

Наогул, нашы грамадскія арганізацыі вельмі мала дапамагалі вучыцца студэнтам, якія прыйшлі з вытворчасці. Гэтыя людзі маюць перарыў у вучобе па 4—5 гадоў. Таму ім была патрэбна канкрэтная дапамога. Але шмат у чым вінаваты і самі студэнты. Аналіз паказвае, што студэнты, якія атрымалі на экзаменах дрэнныя адзнакі, няправільна размяркоўвалі свой час. «Штурмаўшчына» мала каму дапамагла.

Аб выніках сесіі на факультэтах расказалі намеснік сакратара камітэта В. Аляхновіч, члены камітэта М. Неменман, Т. Гірдзюк, студэнт I курса беларускага аддзялення А. Круцько, сакратар камітэта І. Сяргееў і інш. Яны адзначылі, што большасць нашых студэнтаў жадае добра вучыцца. Аб гэтым сведчыць тое, што студэнты, якія прышлі з вытворчасці, у асноўным здалі сесію паспяхова. Той, хто працаваў на працягу ўсяго семестра, здаў экзамены на «добра» і «выдатна».

Рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка сказаў, што кіраўніцтва універсітэта і ў далейшым будзе прымаць ва універсітэт людзей з вытворчасці. Але трэба ім дапамагаць у вучобе. Камсамольская арганізацыя павінна правесці на ўсіх курсах камсамольскія сходы, на якіх патрэбна заслухаць справаздачу тых камсамольцаў, якія правалілі экзамены.

На пасяджэнні камітэта камсамола таксама было абмеркавана пытанне аб стане спартыўнай работы ва універсітэце. З дакладам выступіў загадчык кафедрай фізічнага выхавання Я. М. Маркаў.

☆

НАШ УНІВЕРСІТЭТ наведала дэлегацыя Вільнюскага ўніверсітэта у складзе 19 студэнтаў розных факультэтаў, актывістаў камсамольскай работы. Дэлегаты азнаёміліся з беларускай сталіцай, пабывалі на заводах, у Беларускім Дзяржаўным тэатры імя Янкі Купалы. Апошні дзень свайго знаходжання ў Мінску вільнюскія студэнты прысвяцілі знаёмству з нашым універсітэтам. Члены камітэта камсамола універсітэта Вера Аляхновіч, Света Рудзяк, Марк Неменман паказалі вільнюскім студэнтам універсітэцкія лабараторыі, музеі, кабінеты.

Пазней госці сабраліся ў камітэце камсамола БДУ, каб падзяліцца вопытам камсамольскай работы. Вільнюскія студэнты ўручылі нашаму камітэту камсамола падарункі і запрасілі да сябе ў госці. У час зімовых канікул група камсамольскіх актывістаў БДУ паедзе ў Вільнюскі універсітэт.

☆

ПРЫ КАМІТЭЦЕ камсамола створана агітбрыгада з 20 чалавек. Першае выступленне агітбрыгады адбылося перад выбаршчыкамі—працаўнікамі метэаралагічнай службы. Днямі брыгада выступіла перад рабочымі будаўнічага трэста №17. Будаўнікі цёпла сустрэлі выступленні дэкламатараў Івана Ціханенкава, Зіны Васілевіч, спевака Яўгена Яновіча, танцораў Людмілы Грышачкінай, Аляксандра Бірукова і Уладзіміра Якіменка, гімнаста Рыгора Рэзнікава.

У першай палове лютага агітбрыгада выступіць перад маладымі выбаршчыкамі—студэнтамі ўніверсітэта.

☆

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ наведаў прадстаўнік ЦК ВЛКСМ А. Хрусталёва. Яна дэталёва азнаёмілася з вучэбнай, навуковай, арганізацыйнай, палітыка-масавай работай у камсамольскіх арганізацыях факультэтаў. А. Хрусталёва ўвогуле дадатна ацаніла работу камсамольскай арганізацыі БДУ. Яна зрабіла рад заўваг, дала шмат карысных парад на арганізацыйных пытаннях. Тав. Хрусталёва параіла развіваць больш цесныя сувязі з рабочай і сялянскай моладдзю.

М. БАНДАРЭНКА,
І. СТАРАВОЙТАЎ.



**Пальцы, што выцягваюць экзаменацыйны білет. Момант, калі мы ва ўладзе лёсу. Для адных гэта рыхтуе «вяршкі», а другім застаюцца «карашкі» і пустое месца ў заліковай кніжцы.**

**Але лёс часта здраджвае сваім паклоннікам. Не верце яму!**

**Праўда, лёс можна перахітрыць. Трэба толькі вывучыць усе білеты! Няхай вашым сябрам будзе праца. Яна суровая сяброўка, але ніколі не выдасць!**

**Фотаэцюд А. ЛУКАШОВА.**

## РОЗНЫЯ ВЫНІКІ

Я прымаў экзамены па «Тэорыі літаратуры» і «Асновах літаратуразнаўства» на першым і пятым курсах філфака. Як запаўняюць студэнты, гэтыя прадметы належаць да ліку цяжкіх. І ўсё ж складанасць прадмета не азначае немагчымасць яго вывучэння. Гэта і паказалі адказы пераважнай большасці студэнтаў.

Прыемна было слухаць адказы пяцікурснікаў. Студэнты выказвалі свае меркаванні, прыводзілі свае прыклады, наогул, адносіліся да таго ці іншага пытання самастойна і крытычна.

Сёлетні набор—гэта людзі, якія прышлі непасрэдна з вытворчасці, з заводаў, з калгасаў. У іх ёсць ужо некаторы жыццёвы вопыт і ярка акрэсленая мэта быць журналістам, філолагам і г. д. У журналістаў адчувалася някепская агульная падрыхтоўка, адказы грунтоўней і абгрунтаваны. Дастаткова адзначыць, што першы курс журналістаў здаў экзамен толькі на «добра» і «выдатна». Гэтаму спрыялі і сур'ёзныя і добрасумленныя адносіны да практычных заняткаў.

Наадварот, студэнты I курса беларускага аддзялення адказвалі слаба і няўпэўнена. Некаторыя адказы па літаратуразнаўству набліжаліся да анекдатычных. Блыталі сімвал з сюжэтам, санет з метафарай, бібліяграфію з гекзаметрам, некаторыя не маглі назваць нават аўтара паэмы «Над ракой Арэсай».

Вядома, узнікае пытанне, чаму на гэтых аддзяленнях амаль супроцьлеглыя вынікі. Адказ можа быць адзін: праца, удумлівыя адносіны да вывучэння прадметаў адных і нейкая лёгкадумнасць — у другіх.

Сесія паказала, што толькі працай можна дабіцца сур'ёзных вынікаў на экзаменах.

**Старшы выкладчык КАРАБАН В. С.**

## ШТО ПАКАЗАЎ ЭКЗАМЕН ПА ПЕДАГОГІЦЫ

...Ідзе экзамен па педагогіцы на IV курсе гістарычнага факультэта. За сталом, накрытым чырвоным абрусам, сядзіць экзаменатар, кандыдат педагагічных навук дацэнт Л. В. Шашкоў. Чацвёра студэнтак рыхтуюцца па білетах, а пятая адказвае. Адказвае бойка і ўпэўнена, атрымаўшы «пяцёрку», выходзіць. Месца ля экзаменацыйнага стала займае студэнтка Скроба. Павольна, на першы погляд, але поўна расказвае яна аб мэтах і задачах камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення. Але... звязаць пытанне білета з жыццёва-важнымі задачамі, пастаўленымі ў тэзісах даклада М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС, студэнтка не можа.

Хутка адказвае студэнтка Мірошкіна. Яна ведае напамяць многа цытат з класічнай літаратуры XIX і XX стагоддзяў. Але... нічога не гаворыць аб сучасных важнейшых дакументах, што датычацца перабудовы школы.

Наогул, адказы студэнтаў сведчаць аб тым, што яны нядрэнна ведаюць матэрыял падручніка педагогікі, гісторыю педагогікі і г. д., але не ўмеюць звязаць свае адказы з задачамі сёняшняга дня, з практыкай жыцця.

**Н. БОКАЧ.**

## ГОДЗЕ!

У мінулым годзе па просьбе дэкана філалагічнага факультэта за непаспяховасць рэктарат універсітэта пастанавіў выключыць з ліку студэнтаў 8 чалавек. Сярод іх Валеры Пак, Жана Макацэвіч, Ларыса Пастушонак і інш. Адразу ж пасля паяўлення загаду №217 ад 26 ліпеня 1958 года, дзе гаварылася аб выключэнні гэтых студэнтаў, у дэканат, рэктарат, у камсамольскія і партыйныя арганізацыі пачалося паломніцтва.

Атака вялася шырокім фронтам. У ёй удзельнічалі бацькі выключаных з універсітэта, камсамольцы тых груп, у якой займаліся гэтыя гультаі і абібокі.

— Улічыце цяжкае сямейнае становішча, з-за якога яны атрымалі нездавальняючыя адзнакі,—гаварылі адны.

— Колькі ўжо сродкаў на іх зрасходавана, і раптам,— выганяць... Не, так нельга,— «лагічна» разважалі другія.

Яшчэ да паяўлення загаду аб выключэнні некалькі разоў у дэканат філфака з'яўлялася маці Жаны Макацэвіч.

— Не можа гэтага быць, каб мая Жана не ведала рускай і замежнай мовы, я ж наймаю рэпетытараў,—гаварыла яна.

Ёй раілі ў дэканаце паслаць дачку папрацаваць годдруг на прадпрыемстве. Але маці Жаны заяўляла:

— Гэтаму не бываць! Маю Жану—ды на прадпрыемства! Не, не, што вы...— адмахвалася яна.

Чатыры разы здавала Жана Макацэвіч экзамен па рускай мове: двойчы выкладчыку, адзін раз камісіі на чале з намеснікам дэкана і адзін раз камісіі на чале з дэканам. Усе чатыры разы яе адказы былі прызнаны нездавальняючымі.

Хутка Жана апынулася на завочным факультэце: можа цяпер і ўдасца атрымаць доўгачаканую «троечку».

Валерый Пак за некалькі год знаходжання ва універсітэце не здаў амаль ніводнага экзамена. Ды ён, безумоўна, не мог здаць іх, бо не наведваў лекцый і практычных заняткаў. І гэты гультай апынуўся на завочным факультэце.

Ларыса Пастушонак рэдка наведвала лекцыі і практычныя заняткі, дрэнна вяла сябе ў інтэрнаце, не здала летняй сесіі. Калі яна даведалася аб тым, што яе выключылі з універсітэта, яна прадставіла «выратавальны» дакумент — даведку аб «хваробе», і ёй дазволілі здаваць экзамены не аднавіўшы нават яе ў ліку студэнтаў Ларыса ўжо некалькі разоў спрабавала здаць экзамен па рускай мове і атрымоўвала кожны раз нездавальняючыя адзнакі.

З года ў год пераводзяцца ўмоўна з курса на курс А.Карпіцкая, Ф. Сачава, Г. Клябанаў (апошні заўсёды апраўдваецца, што да яго «прыдзіраюцца» выкладчыкі).

На юрыдычным факультэце студэнты Эдуард Баленда, Нэля Скапцова, Генрых Караткевіч таксама з года ў год маюць запазычанасць. Але чамусьці гэтых студэнтаў цягнуць, хочуць абавязкова выпусціць з універсітэта з дыпломам, але без ведаў. Мусіць для таго, каб потым яны пайшлі працаваць у школу. Лёгка сабе прадставіць, што змогуць даць вучням гэтыя будучыя, з дазволу сказаць, педагогі!

Сваімі паводзінамі студэнтка Клімовіч выклікала агульнае абурэнне ўсяго калектыву філалагічнага факультэта. Сход курса пастанавіў выключыць яе з радоў камсамола і прасіць рэктарат адлічыць з ліку студэнтаў. Гэтую пастанову зацвердзіў камітэт камсамола. Але знайшліся абаронцы, якія ўсяляк стараюцца выгарадзіць Клімовіч, спасылаючыся на дрэнную выхаваўчую работу, якая праводзілася на курсе. Не лішне будзе напомніць гэтым абаронцам указанне У. І. Леніна аб тым, што сутнасць выхаваўчай работы заключаецца не ў тым, каб цешыць моладзь прыгожымі прамовамі, расказваць аб правілах маралі, а ў тым, каб уцягваць яе ў вытворчую працу.

Годзе нянчыцца з абібокамі і гультаямі! Трэба выключаць тых, хто не хоча вучыцца, хто парушае правілы сацыялістычнага супольнага жыцця.

Неабходна памятаць, што на месца кожнага нядобрасумленнага студэнта знойдуць дзесяткі людзей, якія з гонарам апраўдаюць высокае званне савецкага студэнта.

## ДЫПЛОМНІКІ НА ПРАКТЫЦЫ

Ужо больш як месяц студэнты V курса гістарычнага факультэта праходзяць пераддыпломную практыку з мэтай атрымаць навыкі работы над архіўнымі матэрыяламі, гістарычнымі крыніцамі і сабраць матэрыял для напісання дыпломных работ.

Вялікая група студэнтаў працуе пры нядаўна адкрытай ва універсітэце кафедры гісторыі БССР. Больш дзесяці чалавек працуе ў Цэнтральным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР. У сваіх дыпломных работах яны выкарыстоўваюць багаты, яшчэ нідзе не апублікаваны матэрыял з гісторыі Беларусі 1917—1939 гадоў.

Так, Садоўскі Пётр працуе над тэмай «Узмацненне класавай барацьбы ў Беларусі ў 1924—26 гг.», Іна Краснеўская вывучае пытані культурнага будаўніцтва ў Беларусі, Васіль Карпін працуе над тэмай аб ролі прафсаюзаў у сацыялістычным будаўніцтве ў Беларусі.

Група студэнтаў пад кіраўніцтвам кафедры гісторыі КПСС працуе над вывучэннем гісторыі камсамола Беларусі і гісторыі КП Беларусі, выкарыстоўваючы матэрыял Цэнтральнага і мясцовых архіваў.

Студэнт Малевіч Сігізмунд ужо больш як месяц вывучае матэрыял Брэсцкага абласнога архіва, падбіраючы матэрыял для сваёй дыпломнай работы «Барацьба камсамольцаў Брэсцкага ваяводства супроць белапольскіх акупантаў». Рабаў Аляксандр працуе над тэмай «Удзел камсамольцаў Беларусі ў грамадзянскай вайне».

Група студэнтаў вывучае архіўныя матэрыялы ў г. Ленінградзе.

Каля 15 студэнтаў, якія спецыялізуюцца па кафедры гісторыі новага і навейшага часу, у сваіх дыпломных работах распрацоўваюць пытанні міжнародных адносін. Яны выкарыстоўваюць не толькі рускія матэрыялы, але і творы, надрукаваныя на замежнай мове.

**У. КОНАН,**
**член студкараўскага пастарства гістфака.**

## *Самаабслугоўванне як яно ёсць*

Па вуліцы Кірава знаходзіцца інтэрнат, у якім пераважна жывуць студэнты юрыдычнага факультэта. На першы погляд, тут усё ў парадку: ёсць тут савет, ёсць санітарная камісія і г. д. Ёсць усё, толькі няма чысціні і культуры.

Пасля пераходу на самаабслугоўванне санітарнае становішча інтэрната нават некалькі пагоршылася. У калідорах, нібы ў насмешку над чыстымі урнамі, часта валяюцца акуркі, паперкі і г. д.

Пакоі таксама знаходзяцца ў дрэнным стане. Так, у пакоях 11, 12, 17 часта можна бачыць смецце, разбітыя крэслы і сталы. Падлога ўжо даўно забыла, якога яна была колеру, калі яе фарбавалі. Пыл можна сустрэць усюды. Вокны, «задыхаюцца» ад заставіўшых іх кніжак. Пасцелі заўсёды памятыя. На іх часта можна ўбачыць студэнта нават у ботах, у верхнім адзенні.

Часта ўпачы ў пакоях хлопцаў чутны крыкі—ідзе гульня ў карты. А днём пакоі ператварюцца ў свавольную «краіну гультаёў» з дзіцячага мультфільма. Усе спяць, лірычна пахрыпваючы. Дзе там да лекцый! Вельмі сумна, што гэта робяць будучыя юрысты, якія хутка самі будуць выхоўваць людзей у духу сацыялістычнай маралі.

У інтэрнаце жывуць і выкладчыкі, але яны занялі «нейтральную» пазіцыю.

Нядаўна адбыўся сход студсавета, на якім былі абмеркаваны важныя пытанні. Студсавет прыняў адпаведнае рашэнне.

Рашэнне прынята—справа за выкананнем.

**А. АРЦЁМ'ЕЎ.**

**Цікава ведаць**

### ДУХМЯНАЯ ГАЗЕТА

**Існуюць розныя выданні: салідныя, сатырычныя, выданні для жанчын, выданні на каляровай паперы, а вось параўнаўча нядаўна паявілася выданне, узяўшы якое ў рукі чытач адчувае водыр кветак.**

**Такім выданнем з'яўляецца японскі штотыднёвік «Фоміеры», у якім у друкарскую фарбу прымешваюцца парфумерныя рэчывы, што надаюць старонкам трывалы пах. На вокладцы першага нумара намалявана ружа, і старонкі яго пахнуць, як натуральная ружа.**

## СТАРЭЙШЫ БІБЛІЯТЭКАР

*Стрэлка гадзінніка набліжаецца да дзесяці. Аляксандра Іванаўна падыходзіць да стала. Тут усё падрыхтавана для таго, каб праз некалькі мінут пачаўся новы працоўны дзень. І вось з'яўляюцца першыя студэнты. А колькі пабывае ў бібліятэцы за дзень! І кожнага ўважліва выслухае, кожнаму шчыра параіць, ласкава ўсміхаецца гэтая пажылая жанчына.*

*Здаецца, што асаблівага, складанага ў яе рабоце? А ўся складанасць у тым, што працаваць даводзіцца з людзьмі. Як задаволіць пажаданні студэнтаў—аб гэтым думае Аляксандра Іванаўна на рабоце.*

*Яшчэ ў 1936 годзе прышла А. І. Доўнар працаваць у бібліятэку ўніверсітэта. Ёй з малых год падабалася быць гаспадаром кніг. Яна весела перабягала ад адной кніжнай паліцы да другой, і кожны раз па-новаму радавалася, бачачы задаволеныя твары студэнтаў.*

*Але раптам пачалася вайна. Разгубленая, узрушаная гэтым паведамленнем Аляксандра Іванаўна прышла ва ўніверсітэт. Тут, сярод старэйшых таварышаў, поплеч з якімі працавала ўжо пяць гадоў, ёй стала лягчэй, яна адчула сілу.*

*А. І. Доўнар зразумела, што не чакаць трэба, а зараз жа брацца за работу. Разам з іншымі супрацоўнікамі ўніверсітэта, якія засталіся тут, яна пачала ратаваць кнігі.*

*Рызыкуючы жыццём, Аляксандра Іванаўна Доўнар і Антон Канстанцінавіч Ціток пераносілі кнігі, прэпараты, экспанаты ўніверсітэцкіх музеяў, частку архіва. Так дзень за днём на працягу трох тыдняў яны вынеслі з бібліятэкі, дзе размясціўся варожы шпіталь, каля 100 тысяч кніг.*

*На адной з аддаленных ціхіх вуліц горада, у доме з выбітымі ад узрываў бомб шыбамі, яны схавалі кнігі, перанеслі сюды паліцы. Два доўгія, цяжкія, пакутлівыя гады штодзённа па чарзе дзяжурылі тут, седзячы ў гэтым доме з забітымі дошкамі вокнамі, стараючыся нічым не прыцягнуць увагу ворагаў.*

*—Трымайцеся, трымайцеся, даражэнькія! Вось вернуцца нашы—аддзякуюць вам за справу, якую вы зараз робіце,—натхнялі іх дацэнт Яўген Міхайлавіч Зубковіч і асістэнт Анастас Васільевіч Вязовіч.—Прыдуць студэнты ва ўніверсітэт і зноў вы, Аляксандра Іванавна, будзеце выдаваць ім кнігі.*

*Заўсёды ёй прыдавалі сілу бадзёрыя словы Зубковіча і Вязовіча. Аляксандра Іванаўна дачакалася гэтага часу. Не дажылі яны да перамогі. Гітлераўцы расстралялі іх за сувязь з партызанамі.*

*Як неабходны былі кнігі, захаваныя супрацоўнікамі ўніверсітэта, у першыя гады яго работы пасля вайны! І тыя, што захавала А. І. Доўнар, і тыя, што падарылі нашаму ўніверсітэту Маскоўскі і Ленінградскі ўніверсітэты. Колькі ўдзячных пісьмаў атрымала гэтая простая жанчына ад людзей, чые дыпломы, асабістыя справы, дысертацыі захавала яна ў час вайны!*

*Аляксандра Іванаўна Доўнар—старэйшы работнік бібліятэкі. У жніўні мінулага года, калі адзначалаася 50-годдзе з дня нараджэння Аляксандры Іванаўны, рэктарат узнагародзіў яе граматай.*

*Аляксандра Іванаўна — заслужаны старэйшы бібліятэкар.*

*А. ЧАРНЕНКАВА.*

# ЯК МЫ АДПАЧЫВАЕМ

НА ЗДЫМКУ: Студэнткі IV курса юрфака В. Гудкова і Г. Губанава адпачываюць на балконе 4 паверха ў інтэрнаце па вуліцы Кірава.

Фота Я. ЛЯХАВА.

## Усе можна паспець

Вечар у нядзелю ў інтэрнаце па вуліцы Кірава. Бесперапынна стукаюць дзверы, нехта спяшаючыся прабягае па калідоры, часамі даносіцца смех. Адны вяртаюцца стомленыя з чытальнай залы, другія ідуць у кіно, тэатр.

У другакурснікаў юрыдычнага факультэта—калектыўны паход у тэатр. У арганізатара культпаходу Веры Палунінай яшчэ шмат клопатаў. Жадаючых схадзіць на «Эсмеральду» ў оперны тэатр аказалаеся больш, чым узялі білетаў. Але хутка ўсё ўладзілася, і вялікая група студэнтаў з вясёлым шумам вышла з інтэрната. Сярод іх была і Вера...

Пасля спектакля яна рашыла прагуляцца з сяброўкай па вячэрняму Мінску. На вуглу праспекта імя Сталіна і вуліцы імя Янкі Купалы ўтварылася ледзяная дарожка. У жывым калідоры гледачоў коўзаюцца на нагах смельчакі. Шум, смех, жарты, незласлівыя кпіны няўдачнікам, пракаціўшымся на асабістай спіне...

Дома ўжо перад самым сном Вера расказала Галі Шырокавай аб зямельнай рэнце, аб аснаўным эканамічным законе капіталістычнага спосабу вытворчасці, прыводзячы па памяці выказванні К. Маркса з першага тома «Капітала». І калі ўжо пакой спаў, Галя з палёгкай уздыхнула—незразумелае раней стала ясным.

А Вера задумалася аб сваім. Хутка праляцеў дзень. Заўтра трэніроўка ў лыжнай секцыі, потым трэба рыхтавацца да чарговага семінару па савецкаму дзяржаўнаму праву, перакласці тэкст з нямецкай. І аспадарчыя пытанні таксама нельга адкладаць. Новыя клопаты, абавязкі, новыя радасці і новыя засмучэнні, без якіх немагчыма жыццё. Як і ўсе, Вера рада ўдаламу выступленню на семінары, пяцёркі на экзамене.

Часта ўспамінае Вера сваю першую сесію. Тады яе напаткала няўдача—Вера атрымала тройку. Гэта было нечакана. Здаецца, і вучыла прадмет, рыхтавалася да семінараў. І вось--тройка!.. Урок быў улічан. Вера стала займацца яшчэ старанней, уважліва прачытвала рэкамендаваную літаратуру. Вынікі не заставілі сябе доўга чакаць. Летнюю сесію яна здала толькі на «добра» і «выдатна». Старанна займаецца Вера і цяпер.

Яна не толькі сама імкнецца да ведаў. Калі на курсе выдзялялі студэнтаў для дапамогі па замежнай мове рабочым, займаючымся на падрыхтоўчых курсах для паступлення ў БДУ, адной з першых адазвалася Вера Палуніна. «Мне не цяжка,—сказала яна,—ды я і сама буду ведаць мову лепш». Аб яе чуласці, спагадлівасці можа сказаць любы студэнт на курсе. Адчуў гэта і увесь 34 пакой, дзе жыве Вера, і Фаіна Нікіціна для якой Вера ў мароз і вецер бегала за лякарствам, калі тая хварэла.

«Як у цябе хапае на ўсё часу?»—не раз пыталі Веру яе аднакурсніцы і сяброўкі па пакою. «Цяжка зразу адказаць на гэтае пытанне, нельга даць дакладных рэцэптаў,—гаворыць Вера.—Але трэба не адкладваць спраў у доўгую скрынку, эканоміць кожную вольную мінуту. Можна размеркаваць свой час так, каб яго хапіла і для вучобы, і для адпачынку. Нават пасмуткаваць час застаецца»,—ледзь-ледзь усміхнуўшыся, дабаўляе яна.

Н. КЛІМЕНКА.

## Расказваюць аб сваім адпачынку студэнты

☆

**І. ЖУРАЎЛЁЎ**, юрыдычны факультэт, IV курс.

У канцы снежня ў мяне былі дзве экзаменацыйныя сесіі. Апошні экзамен па калгаснаму праву я здаў выдатна. У гэтыя ж дні я ўдзельнічаў у спаборніцтвах барцоў-студэнтаў вузаў рэспублікі. Выступаючы ў лягчэйшай вазе (57 кілаграмаў), заняў 5 месца. Найбольш цікавымі для мяне былі дзве сустрэчы: з Татурам (Горкаўская сельскагаспадарчая акадэмія) і Орлікам (палітэхнічны інстытут). Напружанай была схватка з першаразраднікам Гольдбергам (інстытут фізічнай культуры). Доўга пікому з нас не ўдавалася дабіцца перавагі, але на 10 хвіліне мне ўсё ж прышлося здацца.

Зараз у мяне вытворчая практыка. Але на спорт не забываю. Трэніроўкі, падрыхтоўка да новых спаборнітваў—вось мой адпачынак. Тым больш, што ў мяне ёсць план—атрымаць першы разрад па класічнай барацьбе.

☆

**Е. ВЕЛІЧКА**, матэматычны факультэт, II курс.

Вучоба займае ў мяне вельмі многа часу, але можна знайсці магчымасць і адпачыць. Часцей за ўсё гэта бывае вечарам. Тады можна схадзіць у кіно, тэатр. Пакуль дойдзеш да інтэрната, прагуляешся з задавальненнем. Мне больш падабаецца тэатр Юнага гледача. Вось і нядаўна са сваёй сяброўкай Тамарай Кузняцовай я глядзела камедыю В. Розава «У пошуках радасці».

Зараз у мяне гарачыя дні—ідзе здача экзаменаў за III семестр. Прыходзіцца забывацца аб адпачынку, калі хочаш здаць іх паспяхова.

☆

**Л. САМАХВАЛАВА**, геаграфічны факультэт, II курс.

Мяне вельмі даўно цікавіў парашутны спорт. Але толькі ў гэтым вучэбным годзе я дабілася свайго. Зараз у гуртку мы вывучаем будову парашута, вучымся складваць яго. Хутка наступяць дні, калі ўпершыню адчуем радасць палёта ў паветры... Запісывайцеся ў наш гурток, прыходзьце да нас!

☆ ☆ ☆

## Жыхары двух пакояў

*Кажуць, што матэматыкі—сухары, філолагі—вось народ пачуцця! Няпраўда! У гэтым я пераканаўся, калі пабываў у гасцях у дзяўчат з 22-га пакоя філфакаўскага інтэрната і 22-га пакоя фізікаў і матэматыкаў.*

*У корпусе «А» у 22-ім пакоі была адна Ліда Брыль. Яна толькі што вярнулася з вячэрняй прагулкі і адчувала сябе некалькі сарамліва перад нечаканым і незнаёмым госцем. Але тут у пакой зайшла Ніна Слагада, і завязалася свабодная, ажыўленая размова.*

*— Каця Дзелендзік, Галя Пікулік і мы—на V курсе беларускага аддзялення, а Света Арцюх—на V курсе рускага,—расказвалі Ліда і Ніна.—Часта разам бываем ля тэлевізара, у кіно, не супраць схадзіць на танцы ці на вечар. Нядаўна глядзелі «Забыты ўсімі» і «Бахчысарайскі фантан». Шмат чытаем. Нядаўна ўсім пакоем дыскусіравалі аб «Братах Яршовых» Кочатава.*

*Час-ад-часу ў дзяўчат з'яўляюцца новыя клопаты. Убачаць дзе-небудзь новы ўзор вышыўкі, абавязкова і сабе трэба такі ж раздабыць. І тады ў заціхшым пакоі цэлымі вечарамі спрытна бегаюць рукі дзяўчат, высодзячы новы ўзор. Недарам іх пакой падобны на зал выстаўкі рукадзелля!*

*— Новы год мы сустракалі таксама разам,—дабавілі дзяўчаты,—і яшчэ,—выдалі яны адну тайну пакоя,—наша Галя ўжо не Пікулік, а Галя Булат.*

*Як умеюць адпачываць, так умеюць і вучыцца дзяўчаты з 22-га. Прыемна заглянуць у іх залікавыя кніжкі. А Света Арцюх першынствуе. Яна—сталінскі стыпендыянт...*

*22 пакой у корпусе «Б» быў увесь у зборы. Яшчэ не прыбраны былі навагоднія ўпрыгожванні, і пакой напамінаў куточак сказачнай навагодняй галы. Пад столлю сняжынкі, месяц і зоркі, пад маленькай зялёнай ёлкай—такі ж маленькі Дзед-Мароз. Дзяўчаты расказалі некалькі вясёлых навагодніх гісторый і тут жа перайшлі на дзелавы тон. У пакоі жывуць будучы фізік Ліля Шарык і чацвёра будучых матэматыкаў: Люба Куракава і трыё—Валя Крукоўская, Валя Лашчэўская, Валя Шыбко. А пакуль яны на IV курсе. Разам яны ходзяць у тэатр, на лекцыі-канцэрты, разам чытаюць кнігі. Спрачаліся аб «Вучнёўскіх гадах Андрэя Шабанова» В. Бакінскага, спрачаліся аб «Жыцці Беражкова» А. Бека.*

*Дзяўчаты актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці Ліля—прафорг групы, Валя Шыбко—камсорг, Валя Крукоўская пяе ва універсітэцкім хоры.*

*Ёсць у іх і другія заняткі. Валя Шыбко і Валя Лашчэўская навейваюць айтагурток і да лета ўжо будуць шафёрамі-любіцелямі, а Шыбко, акрамя таго, добрая лыжніца, любіць турызм.*

*Многа можна было б расказаць яшчэ і пра жыхароў двух пакояў і пра іх вучобу.*

*Але, відавочна, і сказанага хопіць, каб упэўніцца, што студэнцкае жыццё б'е ключом у гэтых пакоях. Яны—не выключэнне. Прайдзіцеся па інтэрнатах, і вы ўпэўніцеся ў гэтым самі.*

*Я. ЛЯХАЎ.*

## КОРАТКА

*Каля 400 студэнтаў універсітэта з'яўляюцца ўладальнікамі абанементаў універсітэта музыкальнай культуры. З 12 лекцый-канцэртаў адбыліся шэсць. Студэнты слухалі лекцыі аб беларускай музыцы, аб савецкай песні, аб творах Бетховена, Рымскага-Корсакава, Глазунова, Чайкоўскага, Шастаковіча і Хачатурана. Лекцыі суправаджаліся выкананнем твораў кампазітараў сімфанічным аркестрам (дырыжор Барыс Афанасьеў).*

*Студэнты геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў вось ужо на працягу семестра наведваюць гурток кройкі і шыцця, арганізаваны прафсаюзным камітэтам універсітэта. Заняткі прадаўжаюцца.*

**Старонку падрыхтавалі студэнты II курса аддзялення журналістыкі Н. Кліменка і Я. Ляхаў.**

Аматары. Фотаэцюд А. ЕУТУШЭНКА.

## ІХ „КУЛЬТУРНЫ" АДПАЧЫНАК

**СЦЭНКА І.**

**ВЫКЛАДЧЫК:** Таварыш студэнт, пакіньце чытаць кніжку!

**СТУДЭНТ:** Зараз. Прабачце, калі ласка.

**ДРУГІ СТУДЭНТ (шэптам):** Мішка, дачытвай хутчэй.

**СТУДЭНТ (таксама шэптам):** Зараз. Пачакай крыху, калі ласка.

**СЦЭНКА ІІ.**

На перапынку

На аўдыторыі лётаюць камякі паперы, снег. Крэслы і сталы ў хаатычным беспарадку.

**ПЕРШЫ СТУДЭНТ:** Ванька. пас!

**ДРУГІ:** Ды пастой. Хто яго ведае, куды заляцела. (Перастаўляе стол і некалькі крэслаў. Першы студэнт, жартуючы, стрымлівае гэты рух. Стол падае на падлогу). Ура, знайшоў. Гуляем далей!

**СЦЭНКА ІІІ.**

**ПЕРШЫ СТУДЭНТ:** Ну дык пойдзем у кіно, рэбяты?

**ДРУГІ:** Ха-ха, вялікі цвярознік, пойдзем лепш у падвальчык у «Нёмане». Сапраўдны рай. Можна па маленькай прапусціць, і ніякі камендант не ганяе.

**ПЕРШЫ:** Ну, што ж, ідзем.

**СЦЭНКА ІV.**

У ІНТЭРНАЦЕ.

**ПЕРШЫ СТУДЭНТ,** не распранаючыся кладзецца на ложжак.

**ДРУГІ:** Ты нікуды сёння не пойдзеш?

**ПЕРШЫ:** Ды вось паваляюся гадзіны дзве, тады пайду.

**ДРУГІ:** Давай і я пасплю. (Таксама не распранаючыся кладзецца на ложак).

В. НАЛІМАЎ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 03050 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2900. Зак. 189